**Сівохін Г.А., Сямашка К.У.**

# ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК “ЗАСЛАЎЕ” ЯК ЦЭНТР ПРАЦЫ З КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНАЙ. АД МЕТАНАРАТЫВУ ДА ЛАКАЛЬНАГА ТЭКСТУ

*Ключавыя словы:* Заслаўе, музеі-запаведнікі, скансэны, Гісторыка-культурны музей-запаведнік “Заслаўе”, музейная антрапалогія, партыцыпацыя.

Узніклы ў Заслаўі ў канцы 1960-х філіял Дзяржаўнага музея БССР – зараз гэта Нацыянальны гістарычны музей, – гісторыка-археалагічны запаведнік, як і экспазіцыя “Музей рамёстваў і народных промыслаў”, якая дзейнічала на яго базе, прадстаўлялі спробу стварэння гістарычнага метанаратыву, які ставіў перад сабой за мэту асвятліць “усю” гісторыю Беларусі са старажытных часоў.

У канцы 1980-х на базе філіяла Белдзяржмузея быў утвораны самастойны музей – Гісторыка-культурны запаведнік “Заслаўе” (далей – Запаведнік). Першапачаткова ў канцэпцыю яго развіцця таксама была закладзена канцэпцыя стварэння метанаратыву. Шэраг экспазіцыйных праектаў таго часу выразна сведчаць пра гэта, напрыклад, унікальная экспазіцыя “Музыка вячорак” дэманструе менавіта ўніверсалісцкі падыход да стварэння музейных праектаў.

Аднак з часам намеціліся відавочныя змены ў даследчай і экспазіцыйнай рабоце Запаведніка. У аснову былі пакладзеныя мікрагістарычныя падыходы, лакальная гісторыя займела прыярытэтнае значэнне ў яго рабоце.

Знакавымі сталі праекты стварэння шэрагу экспазіцый, у першую чаргу музеефікацыя гарадскога млына і стварэнне на яе базе экспазіцыйна-выставачнай прасторы “Этнаграфічны комплекс «Млын»”, а таксама незавершаная спроба стварэння комплексу “Хата каваля”, якая зараз прадстаўленая адзіным экспазіцыйным аб’ектам “Кузня”.

На дадзены момант у Запаведніку працягваецца работа менавіта ў рэчышчы мікрагістарычных прэзентацый лакальных наратываў, пра што могуць сведчыць і апошнія праекты, напрыклад “Фотагляды і нарысы Заслаўскіх абшараў. XX ст.” (2022–2023), “Камяні млынара. Вяртанне… З гісторыі сям’і Мяхедак-Савіцкіх – заслаўскіх млынароў і мінскіх майстроў ды каменацёсаў” (2023) і мемарыяльны праект да 120-й гадавіны нараджэння ў Заслаўі Фядоса Шынклера “Падарожжы па вялікім свеце Хвядоса Шынклера. Постлітаратурныя нататкі пра слыннага земляка” (2023) і шэраг іншых. Сярод іх – і адкрыты ў 2023 першы і адзіны ў Беларусі Музей беларускай маляванкі, пры стварэнні якога была спроба прэзентаваць менавіта шэраг самастойных мікранаратываў, звязаных з гісторыяй беларускіх маляваных дываноў.

Важным аспектам у рабоце Запаведніка ў “павароце” да лакальнага тэксту стала работа з мясцовым кам’юніці.

Айчынны “класічны” музей мае досвед работы з лакальным кам’юніці і гэта – не толькі традыцыйная краязнаўчая праца ці традыцыйныя не-/музейныя мерапрыемствы. Грунтуючыся на антрапалагічным/этнаграфічным падыходзе ў сваёй рабоце, у другой палове XX ст. айчынныя музеі ўжо працавалі па методыках, якія ў далейшым была абазначаная як *партыцыпатыўная* і спрыяла ўключэнню музеяў у жыццё мясцовай супольнасці.

Партыцыпатыўная культура / культура саўдзельнасці накіраваная на дыялог паміж самымі living рознымі актарамі і можа выяўляцца, напрыклад, у творчых акцыях, сумесных навучальных праектах альбо ў практыках камунальнага самакіравання. Важным з’яўляецца не сам вынік, які дасягаецца праз практыкі

партыцыпатыўнай культуры, а форма іх рэалізацыі – інструменты і метады, якія дазваляюць дасягнуць патрэбнага выніку.

Таму важнае месца ў рабоце музеяў павінны займаць менавіта партыцыпаторныя тэхналогіі – “інструменты, з дапамогай якіх музей павіненператварацца ў сучаснае, шматграннае, дынамічнае, спагадлівае месца, арыентаванае на патрэбы гледача” [4, с. 20]. Гэта азначае, напрыклад, што пры дапамозе такіх тэхналогій ствараецца магчымасць значна дапоўніць і пашырыць традыцыйную метадалогію музейнай камунікацыі.

Класічны музей у сваёй экспазіцыйна-выставачнай і музейна-педагагічнай рабоце стварае інфармацыйны прадукт, які наведвальнік музея і атрымлівае. І працэс гэты – аднабаковы. У выпадку ж работы па партыцыпатыўнай метадалогіі, музей наадварот – імкнецца стварыць сітуацыю, пры якой існуюць рознанакіраваныя вектары абмену інфармацыяй – музей “выступае ў якасці пляцоўкі, якая аб’ядноўвае розных карыстальнікаў, а тыя выступаюць у ролі стваральнікаў, распаўсюджвальнікаў, крытыкаў і сутворцаў кантэнту. Інакш кажучы, партыцыпаторная ўстанова не гарантуе ўсім аднолькавых уражанняў. Яна дае магчымасць кожнаму наведвальніку атрымаць уласнае ўражанне, у стварэнні якога ён прымае непасрэдны ўдзел” [4, с. 17]. Важнейшым вынікам гэтага з’яўляецца набыццё агульнаствораным кантэнтам прываблівай для ўсіх актараў працэсу формы. Такім чынам партыцыпатыўная культура не толькі стварае арыгінальны кантэнт, але і ўкараняе адмысловыя практыкі кааперацыі і кааптацыі новых ідэй, меркаванняў і г.д.

Запаведнік дэманструе цікавую спробу пабудовы музея як навукова-даследчай установы. Пры яго ўтварэнні было распрацаванае і прапаноўвалася да разгляду вучонай радзе ўстановы некалькі канцэпцый развіцця. Пры абгрунтаваным больш чым крытычным стаўленні да, напрыклад, прапаноў Т. Гаранскай па развіцці Запаведніка, нельга не адзначыць, што нават у гэтай навуковай рабоце відавочная праца па метадалагічнай распрацоўцы навуковай дзейнасці ўстановы і прысутнічае хоць і “наіўны” і “стыхійны”, але вызначаны *этнаграфічны падыход* да музеефікацыі гістарычнай спадчыны: “Кожны асобны пададдзел [прапаноў па стварэнню Запаведніка “Заслаўе” – *Г.С.*], акрамя гістарычнага ракурсу, утрымлівае канкрэтныя прапановы аўтара па скарыстанню і прапагандзе гэтай галіны культуры ці гісторыі горада з тым, каб не парываць цэльнасці ўяўлення дадзенага пытання” [1, арк. 3]. І хаця у гэтых прапановах відавочна прысутнічае памкненне да стварэнне *ідэальных* і *аб’ектыўных* ведаў пра гістарычную спадчыну Заслаўя [1, арк. 2], такая пазітывісцкая “аб’ектыўнасць” шмат у чым можа быць нівеляваная прапанаванымі спробамі карэктнай работы з мясцовай супольнасцю і з музейнымі артэфактамі, іх інтэрпрэтацыяй і музейнай рэпрэзентацыяй [1, арк. 3–4].

Больш грунтоўнай выглядае канцэпцыя развіцця Запаведніка як *музея пад адкрытым небам*, прынятая ў тым жа 1989 г. вучонай радай установы [3, арк. 1]. Нягледзячы на спецыфічны фармат, уласцівы канцу 1980-х – 1990-м гг., дадзеная работа ўяўляецца даволі грунтоўнай і глыбокай: “… адной з галоўных мэт мы ставім перад сабой узнаўленне такога жыццёвага стану жыхароў Заслаўя, пры якім … стрыжнямі гэтага ладу мусяць быць местачковыя рамесніцкая культура і духоўна-матэрыяльны склад жыцця, якія ў сваёй сукупнасці забяспечвалі пераймальнасць веры, ведаў, вопыту. Адсюль вынікае, што аб’ектам уздзеяння Запаведніка павінна быць перш за ўсё свядомасць людзей, якая спрычыняецца да яго культурнай дзейнасці” [3, арк. 1].

Фактычна прапаноўваецца вельмі ўрбанізаваная музеалагічная партыцыпатыўная мадэль – аднаўленне традыцыйнага мястэчка, – якая б згодна з канцэпцыяй развіцця грунтавалася перад усім на трох асноўных прынцыпах: этнаграфічным, мастацкім і краязнаўчым [3, арк. 21].

Важным этапам у стварэнні і дзейнасці Запаведніка з'яўляліся распрацоўка і спробы рэалізацыі канцэпцыі экамузею, якія мелі месца з 1988 да 1994 г. [2, с. 55]. Асновы канцэпцыі развіцця музею палягалі на прынцыпах музейна-антрапалагічнага падыходу, "горад разглядаўся як культурная экасістэма, у якой культурныя і прыродныя кампаненты звязаны паміж сабой прынцыпам самазахавання і самаабнаўлення"[2, с. 56]. Праўда, на пачатку работы дзейнасць музея сустрэла пэўны недавер і, нават, месцамі варожасць з боку тубыльцаў – прыйшлі "чужыя" і штосць спрабуюць намі кіраваць: "Самым жа складаным было атрымаць у мясцовага насельніцтва і ўлад крэдыт даверу, перавесці скептычна-агрэсіўныя адносіны ў плоскасць канструктыўнага ўзаемаразумення, схіліць мясцовых жыхароў да пошуку самабытнасці і новай ацэнкі сваёй спадчыны, традыцый" [2, с. 56].

Як адзначаў тагачасны дырэктар установы А. Калбаска, пры распрацоўцы *экамузейных* прынцыпаў работы Запаведніка было вызначана, што для яго грунтоўнасным "з'яўляецца вяртанне ў жывое асяроддзе згубленых з'яў і элементаў культуры. У сваёй дзейнасці Запаведнік, практыкуючы наватарскія падыходы, галоўнай задачай лічыў устанаўленне сувязяў паміж мінулым і сучаснасцю, жыхарамі і навакольным асяроддзем. Ён спрабаваў правесці ў жыццё тэндэнцыю захавання помніка ў кантэксце з усім прыродным і культурным асяроддзем… [каб – *Г.С.*] захаваць ці вярнуць у асяроддзе чалавека не толькі пэўныя аб'екты і прадметы, але і самі вытворчыя працэсы, рамёствы, згубленыя элементы культуры і навыкі" [2, с. 58–59]. У выніку музей не толькі становіцца рэальна дзеючым цэнтрам партыцыпатыўнасці, але і цэнтрам "побытавага" жыцця – у "галодныя" 90-я узімку на млын, які працаваў не толькі як экспазіцыйны аб'ект, але і як вытворчы – непасрэдна як млын: стаяла чарга саней з мяхамі зерня на памол. Усё гэта, безумоўна, садзейнічала наладжванню стасункаў паміж мясцовай грамадой і Запаведнікам.

Запаведнік ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. рэальна становіцца не толькі культурным цэнтрам жыцця мястэчка, але і генератарам ідэй арганізацыі жыццёвай палітыкі гораду – пры падтрымцы і па ініцыятыве яго быў арганізаваны гарадскі грамадскі камітэт, які актыўна ўплываў на жыццё Заслаўя: "Значнай грамадскай акцыяй, якая мела ў горадзе пэўны рэзананс, стала арганізацыя запаведнікам у верасні 1989 г. экалагічнага мітынгу. Была зроблена выстаўка, праведзены збор подпісаў жыхароў за вынас асфальтавага завода за межы горада" [2, с. 60]. Фактычна музей ператвараецца ў пляцоўку для камунікацыі: музей – гараджане, гараджане – гараджане, гараджане – улады і выступае партыцыпацыйным партнёрам у ролі пасярэдніка і арганізатара дыялогу ўсіх паміж усімі.

І хаця працэс наладжвання камунікацыі не заўжды адбываўся проста і без заганаў, але ён меў месца. Дзеля гэтага Запаведнікам былі прыкладзеныя не толькі агульна-арганізацыйныя намаганні, але і "профільныя" – былі праведзеныя навуковыя даследаванні: "З дапамогай прафесійных сацыёлагаў з Акадэміі навук Беларусі ў 1989 г. супрацоўнікамі запаведніка было праведзена сацыялагічнае даследаванне на тэрыторыі старога горада. Гэта дазволіла высветліць адносіны і стаўленне жыхароў горада да ўстановы і яе дзейнасці. Вынікі апытання былі ўлічаныя пры распрацоўцы канцэпцыі запаведніка" [2, с. 61]. Ні для каго не сакрэт, што такія даследаванні, граматна і карэктна

арганізаваныя і праведзеныя з акадэмічнага пункту гледжання, апрача высвятлення рэальнага стану рэчаў могуць і спрыяць стварэнню пазітыўнага іміджу ўстановы і наладжванню камунікацыі, з чаго Запаведнік і скарыстаўся. Што, у сваю чаргу, пазітыўна паўплывала на стасункі мясцовай супольнасці і Запаведніка і на арганізацыю дзейнасці грамадскага камітэту: "Праводзячы работу па вяртанню абліччу горада «свайго твару», запаведнік не мог абысці праблему назваў вуліц у гістарычнай частцы. Супрацоўнікамі запаведніка было праведзенае апытанне жыхароў. Па яго выніках было прынятае рашэнне гарвыканкама аб змене назваў вуліц: «Вялікай» і «Замкавай» зараз зноў называецца колішняя «Луначарскага», а «Камсамольская» зноў стала «Рынкавай»" [2, с. 62]. Больш затое, менавіта дзякуючы намаганням камітэту жыхароў захавалася гістарычная трасіроўка гэтых вуліц пры пракладанні газаправоду.

*Такім чынам*, нельга сказаць, што партыцыпатыўная культура – штосьці невядомая ў практыках айчынных музеяў. З іншага боку, нельга не адзначыць, што з канца 1990-х і асабліва ў 2000–2010-я гг. назіраўся крызіс партыцыпатыўных практык – крызіс і арганізацыйна-метадалагічны, і экзістэнцыйны. Калі звярнуцца да досведу работы таго ж Запаведніка, то можна канстатаваць, што ў пэўны перыяд асабліва моцна тэндэнцыя да адраджэння элементаў традыцыйнай культуры выявілася праз удзел мясцовых жыхароў у арганізацыі і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў – ад этнаграфічных абрадаў і рытуалаў да пленэраў сучаснага мастацтва. На жаль, большасць з такіх мерапрыемства зараз ужо праходзіць без удзелу саміх жыхароў – ім аддаецца роля выключна гледача-назіральніка. Менавіта тут і маглі б прыйсці на дапамогу сучасныя метадалагічныя падыходы ў партыцыпатыўнасці і скіраванасць ў экспазіцыйнай і культурна-адукацыйнай рабоце да лакальнага кантэксту.

Трэба прызнаць, што на сёння немагчыма не толькі паўтарыць ранейшы поспех лакальнай музейнай партыцыпацыі з ранейшай жа метадалогіяй. Аднак спалучэнне колішніх дасягненняў і новыя метадалагічныя падыходы маглі б даць плён.


1. Гаранская, Т. Прапановы па стварэнню запаведніка "Заслаўе": Заслаўе на Меншчыне (1989) / Т. Гаранская // Навуковы архіў ДУ "Гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе" (НА ГКМЗЗ).
2. Калбаска, А.М. Музейны дыярыуш ці Уваходзіны ў новую музеялогію/ А.М.Калбаска. – Мінск : БелІПК, 1999. – 148 с.
3. Канцэпцыя развіцця Гісторыка-культурнага запаведніка "Заслаўе" (1989) // НА ГКМЗЗ.
4. Саймон, Н. Партиципаторный музей / Н. Саймон ; пер. А.Глебовской. – М. : Ад Маргинем Пресс, 2017. – 368 с.



**Сімакоў А.В.**


## МУЗЕІ І ТЭМЫ: ВОПЫТ ПЕРАПІСКІ ІНДЗЕЯНІСТАЎ ГОМЕЛЯ З МУЗЕЯМІ


*Ключавыя словы:* музеязнаўства, індзеяністыка, карэспандэнцыя, калекцыі, Гомель, класіфікацыя, персаналіі.


Частай тэмай у размовах гомельскіх індзеяністаў была ідэя стварыць уласны музей, публічны цэнтр – індзейскі музей, музей Чэ Гевары або Лацінаамерыканскі цэнтр. Індзеяністы-аматары звычайна маюць тую ці іншую колькасць "прадметаў музейнага значэння" – мадэлі і імітацыі матэрыяльнай культуры, плакаты, буклеты, значкі, маркі і г.д. (яркая атрыбутыка, несумненна, прыцягвае наведвальнікаў, але падтрыманне такога самадзейнага "пункта ўвагі" ў еўрапейскіх краінах ажыццяўляецца пераважна ў выглядзе "індзейскіх вёсак"